Салаўёў М.

# ГЭТЫ АПОШНІ БОЙ

**Закончыўся студзень. Менш чым сто дзён заставалася да светлага і радаснага дня 9 мая 1945 года. А вайна яшчэ бязлітасна лічыла свае ахвяры. 1 лютага ў жорсткім баі загінуў Сяргей Каваленка, выхаванец Ленінскага камсамола Беларусі. Загінуў на нямецкай зямлі, каб ніколі Малох вайны не прыходзіў на яго родную савецкую зямлю, у яго краіну...**

Што расказаць пра радавога чырвонаармейца стралковай роты? Што выбраць з кароткага – усяго 24 гады, – але яркага жыцця? Успомніць аб вучобе ў Магілёўскай чыгуначнай школе ці аб прызыве ў армію? Але ж вучоба была справай звычайнай, а служба ў арміі вельмі кароткай: дэмабілізавалі Сяргея месяцы праз тры-чатыры па стану здароўя.

А можа расказаць аб гераічнай абароне Магілёва ў чэрвеньскія дні сорак першага, у якой слесар "Сантэхбуда" Каваленка прымаў актыўны ўдзел? Сведкі тых незабыўных дзён успамінаюць, што смеласці і знаходлівасці юнака здзіўляліся нават бывалыя воіны. А праз некалькі месяцаў, кінуты гітлераўцамі ў лагер ля Быхаўскіх казарм, ён лютаўскай ноччу, пад завыванне завірухі, з некалькімі таварышамі пераадолеў калючы дрот і вырваўся на волю, прайшоў нялёгкі шлях у лес, да партызан. Там са зброяй у руках удзельнічаў у многіх аперацыях.

Так, у кароткай, але баявой біяграфіі беларускага камсамольца нямала яркага, цікавага. Гэта ён, баец стралковай роты, у самы цяжкі момант, калі над байцамі і камандзірамі навісла смяротная небяспека, зрабіў крок наперад і сабою, сваім гарачым сэрцам, сваімі грудзьмі закрыў таварышаў, засланіў іх ад свінцовай смерці.

Успамінаючы аб апошнім кроку камсамольца Каваленкі, міжволі думаеш, што гэта быў крок салдата ў бессмяротнасць, крок праз тую нябачную рысу, пераступіўшы якую чалавек хоць фізічна і перастае жыць, але назаўсёды застаецца ў памяці людзей. І жыць будзе вечна, таму што памяць аб героях – бессмяротная. Яны заўсёды з намі, заўсёды побач.

Сяргею ішоў толькі 24-ы год, калі ў 1944-м партызанскі атрад злучыўся з рэгулярнай часцю Чырвонай Арміі. І Каваленка пайшоў на фронт. Тады ён не ведаў, што лёс адмераў яму менш чым год жыцця. Але ён быў гатовы да таго, каб аддаць жыццё за таварышаў, за Радзіму. Быў гатовы, таму што быў салдатам. А справа салдата на фронце – хадзіць у атаку, біць фашыстаў, ісці наперад.

І ён ішоў са сваёй ротай наперад. Франтавая дарога Сяргея пралягла ад родных беларускіх лясоў да заходняга берага чужой ракі

Одэр. Пралягла, пакінуўшы ззаду сотні цяжкіх кіламетраў, каб там, за ракой, на невялікім плацдарме ля горада Шуркаст, абарвацца, а юнака назаўжды пакінуць маладым, 24-гадовым камсамольцам.

Гэта здарылася вечарам 1 лютага 1945 года, у тым апошнім баі. Байцы пятай стралковай роты, як і ўвесь батальён, рыхтаваліся да атакі: камандзір палка маёр Іваноў загадаў капітану Паліканаву выбіць фашыстаў з траншэі, каб расшырыць плацдарм. Нялёгкая гэта была справа – трэба было прарвацца праз двайную лінію варожых дзотаў. А яны не маўчалі ні мінуты, усё палівалі кулямётным агнём. Не раз і не два ўзнімаліся воіны ў атаку. Час ішоў, рады батальёна таялі, але наперад прайсці не ўдавалася ніяк. Тут і пачуў радавы Каваленка кліч капітана: "Добраахвотнікі, да мяне!»

Да камбата падпаўзлі сем чалавек, і сярод іх – Сяргей.

– Гатовы? – толькі і спытаў іх Паліканаў.

– Гатовы, – за ўсіх адказаў Каваленка.

– Ідзіце, – ціха прамовіў камандзір.

І сямёрка адважных пайшла. Не, не пайшла, папаўзла па-пластунску, ад купіны да купіны, уціскаючыся ў зямлю, хаваючыся за яе няроўнасці, тулячыся за рэдкімі кустамі. У пяці метрах ад ланцуга атакуючых назаўжды засталіся двое. Яшчэ праз дзесяць – загінулі адразу трое. Наперад поўз толькі Каваленка з таварышам.

Так яны пераадолелі яшчэ нейкую адлегласць. Можа, метраў пяць, а можа, і ўсе дзесяць. Да дзота заставалася яшчэ метраў 15, калі кулямётная чарга скасіла таварыша...

Салдат застаўся сам-насам з варожым кулямётам. Не спужаўся ён, не адступіў, а смела і ўпарта поўз наперад. Падабраўся да дзота на кідок гранаты, кінуў яе ў амбразуру. Грымнуў выбух. Рота ўзнялася ў атаку, але яе зноў сустрэў свінцовы ўраган...

Сяргей Каваленка быў у некалькіх метрах ад варожага дзота. Ен бачыў, што фашысцкія кулі знаходзяць свае ахвяры. Ён разумеў, што лёс баявых таварышаў залежыць ад яго, што ў гэтыя некалькі імгненняў, адпушчаных яму вайной, толькі ён можа выратаваць таварышаў, выручыць іх са смяротнай небяспекі, дапамагчы роце выканаць баявую задачу. Сяргей разумеў, што ён павінен зрабіць, і ён гэта зрабіў.

Бачылі байцы пятай роты, як ускочыў Каваленка з зямлі, як узмахнуў сціснутым у руцэ аўтаматам і кінуўся да амбразуры. Пачулі байцы яго апошнія поклічныя словы: "За нашу Радзіму!" І настала цішыня. Нечаканая, раптоўная, а таму і незвычайная і ў нечым цудоўная: гэта змоўк варожы кулямёт, захлынуўшыся гарачай крывёю салдата...

Не вытрымалі гітлераўцы ўдару. Кожнаму байцу пятай стралковай роты здавалася, што наперадзе рашуча крочыць Сяргей Каваленка, і кожны імкнуўся ўсімі сіламі дапамагчы адважнаму камсамольцу.

Праз некалькі гадзін, калі гукі бою крыху заціхлі, вярнулася рота да таго дзота. Беражліва паднялі байцы цела салдата, разам з іншымі

байцамі пахавалі ў брацкай магіле на беразе Одэра, зусім непадалёк ад агнявой кропкі, якую сваім жыццём прымусіў змоўкнуць беларускі камсамолец.

У той дзень, калі хавалі яго, не змог маёр Іваноў скласці рэляцыю аб подзвігу салдата. Але пасля замацавання на плацдарме камандзір палка напісаў прадстаўленне: "За свой подзвіг і праяўленую салдацкую доблесць радавы пятай стралковай роты Каваленка Сяргей Анісімавіч дастойны прысваення звання Героя Савецкага Саюза".

Нядоўга хадзіла гэта прадстаўленне па інстанцыях: 10 красавіка 1945 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пасмяротна прысвоіў званне Героя Савецкага Саюза радавому С. А. Каваленку. Ён стаў адзінаццатым з ураджэнцаў Беларусі, якія паўтарылі подзвіг А. Матросава на франтах Вялікай Айчыннай.

**Салаўёў, М. Гэты апошні бой / М. Салаўёў // Чырвоная змена. — 1985. — 8 мая. — С. 2.**